# ГІМНАГРАФІЯ ПРАВАСЛАЎНАГА БОГАСЛУЖЭННЯ Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ (XX – пачатак XXI стагоддзя)

**Чарнова Кацярына Аляксееўна**
навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (аддзел музычнага мастацтва і этнамузыкалогіі); кандыдат мастацтвазнаўства (г. Мінск, Беларусь)

На ўсім працягу гісторыі праваслаўя гімнаграфія (стэма кананічных богаслужбовых тэкстаў) з'яўлялася аб'ектам музычных рэцэпцый ("прачытанняў", "перакладаў"). За свой двухтысячагадовы шлях гэты працэс акумуляваў шэраг стылявых змен. У гістарычнай разнастайнасці музычных пластоў богаслужбовага спеву шмат што звязана з асобай кампазітара, уваход якога ў сферу сакральных тэкстаў накіраваны, перш за ўсё, на ўласнае творчае (мастацкае) іх увасабленне.

Жанрава-стылявая панарама музычнай культуры Беларусі XX – пачатку XXI ст. сведчыць аб шырокай запатрабаванасці ў беларускай кампазітарскай творчасці жанраў гімнаграфіі праваслаўнага богаслужэння. Спецыфічнасць лініі музычных "перакладаў" кананічных тэкстаў богаслужэння ў вопытах беларускіх кампазітараў, якая выразна разгортваецца ў XX ст., заключана ў своеасаблівай "этапнасці", наяўнасці перыядаў "маўчання" (фактычнай "адсутнасці" рэлігіі і, адпаведна, "маўклівасці" кампазітарскай творчасці ў дадзенай сферы) і актыўнага "уздыму". Зразумела, складанасць гэтага разгортвання была абумоўлена гістарычна-палітычнымі падзеямі ў жыцці краіны: натуральны разгорт беларускага кампазітарскага працэсу ў галіне богаслужбовага спеву быў перапынены ў 20–30-я гг. XX ст. ў сувязі з магутнымі эміграцыйнымі хвалямі, у тым ліку "унутранай эміграцыі", а таксама атэістычнымі выпрабаваннямі савецкага часу. Сур'ёзныя наступствы для беларускай музычнай культуры мела і эміграцыйная хваля ў пасляваенны час, у выніку якой кампазітарская дзейнасць у жанрах праваслаўнага богаслужбовага спеву была працягнута ў коле "беларускага замежжа": літургічныя творы праваслаўнай традыцыі М. Куліковіч-Шчаглоў быў вымушаны ствараць у Злучаных Штатах Амерыкі, а М. Равенскі – у Бельгіі. Доўгі час гэтыя вопыты, невядомыя шырокай грамадскасці, не былі ўведзены ў навуковы і выканальніцкі абіход.

Апошнія дзесяцігоддзі XX ст. сталі знакавымі і шмат у чым вызначальнымі для праваслаўнай богаслужбова-пеўчай традыцыі і ўсёй беларускай музычнай культуры. Адзначаныя моцнай хваляй адраджэння "рэлігійнасці" у культурнай традыцыі і нацыянальным адраджэнцкім рухам, яны далі магчымасць вывучэння і актыўнага выканання твораў А. Туранкова, М. Анцава, А. Валынчыка, М. Куліковіча-Шчаглова, М. Равенскага, М. Бутомы як ў храме, так і з канцэртнай эстрады.

Месца, якое ў музычнай культуры Беларусі рубяжа XX–XXI стст. акрэсліваецца праваслаўнымі песнапеннямі, – сведчанне безумоўнай запатрабаванасці хрысціянскіх каштоўнасцей сучасным грамадствам. У факце вяртання "страчаных форм" культуры, кантакту з традыцыяй богаслужбовага



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

спеву, новага і вельмі актыўнага запатрабавання гімнаграфічнай спадчыны немагчыма не адчуць цуд дзейнасці культурнага рэзанансу (“рэзананс-фактару”, паводле Э. Аляксеева), абуджэння глыбінных механізмаў культуры, непросталінейных і, як усё генетычнае, непаваярхоўных.

Разам з агульным адраджэнцкім уздымам рубеж XX–XXI стст. на Беларусі адзначаны актыўным асваеннем кампазітарамі сферы сакральных тэкстаў Праваслаўнай Царквы. Корпус кампазітарскіх твораў, якія сведчаць пра спробы музычнага ўвасаблення праваслаўнай гімнаграфіі ў адпаведным коле яе кананічных тэкстаў, належыць дастаткова шырокай групе беларускіх творцаў. Сярод ніх – айцец Андрэй (Бандарэнка), М. Васючкоў, Л. Шлег, А. Хадоска, А. Залётнеў, С. Бельцюкоў, В. Кузняцоў, С. Бугасаў, А. Даньшова, А. іваноў. Г. Кароткіна і іншыя.

Беларускі кампазітарскі вопыт XX – пачатку XXI стагоддзя ў галіне музычных “перакладаў” кананічных тэкстаў праваслаўнага богаслужэння (псалмоў, малітваў, нязменных песнапенняў з чыну Літургіі, Усяночнага Трывання, Паніхіды, кананічных гімнаў Святаў) выразна сведчыць пра разнастайнасць індывідуальных творчых стыляў і манер у музычных увасабленнях богаслужбовых гімнаў, а таксама раскрывае карціну відавочных адрозненняў у стаўленні творцаў да сакральнага слова.

Пры параўнанні кампазітарскай творчасці першай паловы XX ст. і рубяжа XX–XXI стст. адметнымі апынаюцца:

1. ступень актыўнасці ўваходу кампазітараў у сферу свяшчэнных тэкстаў Праваслаўнай Царквы. Аўтарскія ўвасабленні гімнаграфіі праваслаўнага богаслужэння канца XX – пачатку XXI не маюць у творчасці кампазітараў усепаглынальнага значэння: зварот да сакральнай славеснасці не перашкаджае іх актыўнай дзейнасці ў галіне свецкага музычнага мастацтва, а для большасці кампазітараў меў адзінкавы (“кропкавы”) характар, выступіў як адлюстраванне пэўнай “моды”, вынік дзеяння агульнай, шырока праяўленай тэндэнцыі прыпадання да скарбніцы праваслаўнай традыцыі, сфарміраванай хваляй рэлігійнага адраджэння (А. Залётнеў, С. Бельцюкоў, В. Кузняцоў і інш.). Выключэннем у гэтым “часовым захапленні” выступае бадай толькі творчасць айца Андрэя (Бандарэнка), які яшчэ пасля рукапакладання ў сан іерэя свядома абмежаваў сваю творчасць музычнымі “перакладамі” кананічных гімнаў праваслаўнага богаслужэння.

У сваю чаргу ў творчасці тых кампазітараў, якія працавалі ў сферы праваслаўнай гімнаграфіі ў першай палове XX ст., сачыненні на кананічныя малітваслоўі ўтвараюць адну з магістральных і, безумоўна, скразных ліній. Прынамсі, М. Анцаў, М. Бутома ажыццяўлялі ўласныя “пераклады” песнапенняў праваслаўнага богаслужэння няспынна на працягу ўсяго жыцця, і вядомы ў першую чаргу менавіта як царкоўныя кампазітары Беларусі[1]. Увагай да літургічных тэкстаў шмат што прасякнута ў спадчыне А. Туранкова, М. Куліковіча-Шчаглова, М. Равенскага – стваральнікаў аўтарскіх версій не толькі кола нязменных песнапенняў з Літургіі, Паніхіды, Усяночнага Трывання, але і Прычаснаў на кожны дзень тыдню (А. Туранкоў), трапароў і кандакоў Святаў.

[1] У гэтым плане вылучаецца дзейнасць М. Бутомы, які пакінуў больш за 300 харавых партытур – выдатных адбіткаў “уласнага аўтарскага абіходу” царкоўнага спявання.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

2. характар арыентацыі кампазітарскіх “перакладаў” на храмавае (кліpасная практыка) або пазахрамавае (канцэртнае) гучанне з адпаведнай абумоўленасцю гукасферы кампазітарскіх партытур або тапахронам храма (літургічныя сачыненні кампазітараў першай паловы ХХ ст.), або тапахронам канцэртнай залы (кампазітарская творчасць канца ХХ – пачатку ХХІ ст.).

3. музычная стылістыка аўтарскіх увасабленняў богаслужбовых тэкстаў, якая адлюстроўвае, з аднаго боку, ступень адпаведнасці канону праваслаўнага богаслужбовага спеву, а з другога – індывідуальнасць творчых кампазітарскіх манер. Паколькі кампазітары першай паловы ХХ ст. (М. Равенскі, М. Бутома, М. Куліковіч-Шчаглоў, А. Валынчык, А. Туранкоў) выступалі яшчэ і як рэгенты, якія цудоўна ведалі спецыфіку праваслаўнага богаслужбовага спеву, усё “магчымае” і “недазволенае” у ім, то прапанаваныя імі музычныя версіі кананічных богаслужбовых гімнаў – узор ахоўнага, “рэгенцкага падыходу” да гімнаграфічных тэкстаў богаслужэння з прынцыповай арыентацыяй на богаслужбова-пеўчую традыцыю і гукастылявыя законы праваслаўнага храмавага спеву.

Як асоба, кампазітар імкнецца перш за ўсё да адбіцця ў “прадуктах” сваёй дзейнасці ўласнага “я”. Гэта аўтарскае “слова”, з увасобленым у ім індывідуальным стылем і ўласным светаўспрыманнем мастака. Сакральнае слова, пададзенае без сувязі з прыхадской богаслужбовай практыкай, паўстае ў кампазітарскіх творах рубяжа ХХ–ХХІ стст. аб’ектам уласна мастацкай распрацоўкі – тэкстам, які стымулюе творчы пошук, думку і кампазітарскае натхненне. Адпаведнасць пеўчым канонам праваслаўнай традыцыі не з’яўляецца прынцыповай пры стварэнні ўласнай “музычнай малітвы” з выразным адбіццём індывідуальнага творчага стылю.

Беларуская кампазітарская творчасць ХХ – пачатку ХХІ ст ў галіне праваслаўнага спеву сёння, паводле сваіх вынікаў, бачыцца неадназначнай. Разам з тым, імкненні кампазітараў, хоць і розныя па ступені шчырасці і духоўнай глыбіні, далучыцца да самой традыцыі праваслаўнага богаслужбовага спеву сцвярджаюць, што гімнаграфія праваслаўнага богаслужэння невычэрпная ў сваім хранатопе. Адчуванне магутнай сілы Святога слова, якое аб’ядноўвае ўсе “сусветы”/стылі музыкі, абавязвае зноў і зноў прыпадаць да гэтага “канцэнтрату” духоўнасці.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова